УДК 314.1:321.01(476)(091)“1950/1960”

# АСАБЛІВАСЦІ ГРАМАДСТВА БССР У 50–60-я гг. XX ст. ЯК ФАКТАР РАЗВІЦЦЯ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ

*Поляк Наталля Аляксандраўна*
дацэнт кафедры філасофіі і паліталогіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт»;
кандыдат гістарычных навук, дацэнт
(г. Мінск, Рэспубліка Беларусь)

*У артыкуле гаворыцца аб вызначальнай ролі соцыума ў дзяржаўнаўтваральных працэсах і разглядаюцца асаблівасці беларускага савецкага грамадства ў 50–60-я гг. і іх уплыў на прыняцце палітычных рашэнняў камуністычнай партыяй.*

Падрабязнае вывучэнне гісторыі беларускай дзяржаўнасці ў апошні час стала асноўным накірункам дзейнасці айчынных даследчыкаў. Нягледзячы на тое, што гістарыяграфія гісторыі Беларусі досыць багатая, на сённяшні дзень застаецца шмат недаследаваных тэм. Ёсць у гісторыі нашай дзяржавы цэлыя перыяды, якія патрабуюць больш дасканалага вывучэння з улікам нацыянальнай факталогіі.

На наш погляд, пасляваенныя часы ў гісторыі беларускай дзяржаўнасці з'яўляюцца аднымі з самых значных і адначасо-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ва нявывучаных. У першую чаргу з-за таго, што фарміраванне айчыннай даследчыцкай гістарычнай школы пачалося толькі ў 90-х гг. XX ст., а разгляд савецкай Беларусі навукоўцамі папярэдняга часу быў у асноўным даведачна-інфармацыйным. Савецкія гісторыкі пісалі на падставе гісторыка-партыйнага падыходу і часта не разглядалі эвалюцыйных змен у грамадскім асяроддзі, якія былі накіраваны на развіццё беларускай дзяржаўнасці ў 50–70-я гг. XX ст. Значнасць абранай тэмы падкрэсліваецца яшчэ і тым, што цікавасць да пытанняў грамадскага жыцця ў дадзены прамежак часу вызначана ўзнікшай неабходнасцю ведаў, пазбаўленых догм і аднабаковасці.

Вывучэнне грамадства БССР і асаблівасцей адносін у ім у перыяд "адлігі" і "застою" з'яўляецца асноўнай мэтай артыкула. У ім робіцца спроба паказаць, як сацыяльны склад насельніцтва Савецкай Беларусі ўплываў на ўдасканаленне палітычных працэсаў, змены ў кіраванні грамадскай сістэмай і гаспадаркай. Гэта, у сваю чаргу, былі фундаментальныя элементы дзяржаўнасці.

Грамадства Беларускай ССР пасля XX з'езда КПСС і выступлення М. Хрушчова 24 лютага 1956 г. пачало адчуваць агульнасаюзныя тэндэнцыі дэмакратызацыі. Кіраўніцтва ЦК КПБ з 1956 г. ажыццяўляў К.Ц. Мазураў, які ўмацоўваў прынцып калектыўнасці партыйнага кіраўніцтва і далучэння грамадства да дзяржаўных спраў (сустрэчы насельніцтва з партыйнымі лідарамі, выбарнасць на дзяржаўныя пасады, пашырэнне складу партыйных раённых і гарадскіх камітэтаў, заахвочванне радавых камуністаў да ўнутрыпалітычнага жыцця).

Сацыяльна-дэмаграфічная сітуацыя БССР у гэты час мела шэраг асаблівасцей у параўнанні з астатнімі савецкімі рэспублікамі. Сярод характарыстык неабходна больш падрабязна спыніцца на прафесійным складзе, нацыянальным, полаўзроставым, сярэдняй працягласці жыцця, узроўні медыцынскага абслугоўвання. Таксама інфарматыўным з'яўляецца ступень урбанізаванасці грамадства, узровень натуральнага прыросту, адукаванасць насельніцтва і іншыя дэмапаказчыкі, што, на наш погляд, дапаможа адказаць на пытанне аб уплыве соцыума на ўрадавыя працэсы і дзяржаваўмацаванне. Пры тым, што сярод унутраных фактараў дзяржаўнасці даследчыца А.Г. Панамарова менавіта паказчыку "дэмаграфічныя характарыстыкі", згодна з аўтарскай методыкай, адводзіць найвышэйшы бал [3, с. 21].

Што сабой уяўляла грамадства Беларусі ў сярэдзіне 50–60-х гг., адказаць досыць складана. Вядома, што па выніках усесаюзнага перапісу насельніцтва 1959 г. у БССР налічвалася 8 млн 60 тыс. чалавек, з іх 31% пражывала ў гарадах, 69% – у вёсцы, 509,5 тыс. жылі ў Мінску [4, с. 138]. Да 1970 г. (год наступнага перапісу) назіраўся прырост амаль на 1 млн чалавек, колькасць насельніцва Мінска налічвала каля 900 тыс.

Згодна з перапісам 1959 г. толькі 19% працавала ў прамысловасці і будаўніцтве. У сувязі з тым што назіраўся істотны рост тэмпаў развіцця розных галін прамысловасці (машынабудаванне, хімічная, нафтахімічная, паліўна-энергетычная, лёгкая), ішоў значны прырост рабочых у іх. Павелічэнню колькасці рабочага класу садзейнічала складанае становішча жыхароў вёскі і занятых у калгасах людзей. Міграцыя ў горад сельскіх жыхароў, у асноўным моладзі, у пошуках працы паскаралася, але пры гэтым гараджане захоўвалі ў сваім жыцці вялікую долю сельскагаспадарчай працы.

Жыццё ў вёсцы ўскладнялася не толькі цяжкай працай і фізічнай ліквідацыяй "неперспектыўных" населеных пунтаў, але адсутнасцю любой магчымасці наладзіць дабрабыт. Нізкі заробак, адсутнасць інфраструктуры, дэфіцыт тавараў першай неабходнасці. Пра гэта сведчыць шэраг прынятых савецкай уладай законаў. Так, пенсіі калгаснікам да 1964 г. не выплочвалі ўвогуле, а пасля прыняцця пастановы "Аб пенсіях і дапамогах членам калгасаў" матэрыяльную падтрымку давалі далёка не ўсім (толькі членам сельгасарцелі) [2, с. 394]. Заработная плата і пенсіі калгаснікаў былі вельмі нізкімі, таму пражыць можна было толькі з прысядзібнай гаспадаркі.

Працоўнае насельніцтва папаўнялася яшчэ і за кошт прыбываючых вайскоўцаў і рабочых з іншых краін, спецыялістаў з розных сфер прамысловай вытворчасці, у большасці рускіх, якія накіроўваліся для рэалізацыі задач савецкай улады. Паступова рабочы клас прыступаў да выканання сваёй гераічнай ролі ў пабудове сацыялістычнай дзяржавы. Пры гэтым беларускае насельніцтва займала пазіцыю выканаўцаў, а не кіраўнікоў, аб чым сведчыць невялікая доля этнічнага небеларускага насельніцтва ў кіраўніцтве партыі і на адміністрацыйных пасадах буйных прадпрыемстваў. Пацвярджае гэта назіранне вялікая колькасць зваротаў (прыватных і ад арганізацый) у Міністэрства асветы БССР, дзе гучала просьба арганізаваць работу школ на рускай мове і дазволіць не вывучаць беларускую ўвогуле. На прадпрыемствах працуюць спецыялісты рускай нацыянальнасці, а яны зацікаўлены ў рускамоўным навучанні сваіх дзяцей [1, с. 73].

Аб ступені ўдзелу рабочых і сялян у развіцці і пабудове беларускай дзяржаўнасці савецкага часу таксама могуць сведчыць дадзеныя аб прафсаюзных арганізацыях. Колькасць членаў прафсаюзаў БССР вырасла ў два разы. У 1954 г. іх налічвалася 1030 чалавек, а ў 1963 г. – 2135 [1, с. 58]. Рост колькасці членаў пацвярджаў той факт, што працоўныя былі зацікаўлены ў павелічэнні вытворчасці, пашырэнні актыўнасці ў супрацоўніцтве з партыйна-палітычным кіраўніцтвам краіны, росце ўласнага аўтарытэту.

Уплывовай і досыць масавай была маладзёжная арганізацыя – Ленінскі камсамол. Намаганні ЦК КПБ забяспечыць актыўны ўдзел юнакоў і дзяўчат Беларусі ў будаўніцтве і ўмацаванні дзяржаўнасці, як агульнасавецкай, так і беларускай, давалі свой вынік. Выказванне патрыятычных настрояў моладдзю праз актыўны ўдзел ва ўсесаюзных добраахвотных атрадах садзейнічала дзяржаўнаўтваральным працэсам. Моладзь Беларусі з вялікім энтузіязмам і патрыятызмам брала ўдзел у будоўлях, якіх налічвалася каля 19 (Лукомская ДРЭС, Мазырскі нафтаперапрацоўчы завод, Белшына, Салігорскі калійны камбінат і інш.). Маладыя людзі забяспечвалі эканамічны рост сваёй краіны, працуючы і ў сельскай гаспадарцы, і на розных сацыяльна значных аб'ектах (будоўля жылога фонду, школ, дзіцячых садкоў, лазняў, бальніц і паліклінік, складоў і магазінаў).

Фактар, які істотна ўплываў на развіццё і ўмацаванне дзяржавы, – гэта нацыянальны склад насельніцтва БССР. Статыстычныя дадзеныя за 1959 г. дэманструюць наступную карціну: 81,1% – беларусы, 8,2% – рускія, 6,7% – палякі, 1,7% – украінцы, 1,9% – яўрэі, 0,4% – іншыя нацыянальнасці [1, с. 55]. Своеасаблівая сітуацыя склалася пасля абвяшчэння ў пачатку 60-х гг. курсу на паступовае зліццё нацый для ўмацавання дзяржавы і хутчэйшага будаўніцтва камунізму. Калектыў аўтараў Інстытута гісторыі НАН Беарусі ў пяцітомніку па гісторыі беларускай дзяржаўнасці выказаў думку аб тым, што скарачэнне колькасці беларускамоўных школ і колькасці гадзін вывучэння беларускай мовы садзейнічалі ўмацаванню тэндэнцыі развіцця нацыянальнай літаратуры і мастацтва і пашырэнню нацыянальнай самасвядомасці [1, с. 80]. Але трэба ўлічваць той факт, што гэтая тэндэнцыя назіралася сярод невялікай групы інтэлігенцыі і людзей, якія мелі вышэйшую адукацыю, асноўная ж маса рабочых і сялян разважала катэгорыямі, якія трансліраваліся партыйным кіраўніцтвам аб "далейшай уніфікацыі" і "выхаванні пачуцця савецкага патрыятызму і сацыялістычнага інтэрнацыяналізму" [1, с. 70]. Пытанне аб нацыянальным складзе насельніцтва БССР у 50–60-я гг. XX ст. і ўплыве гэтага сацыяльна-дэмаграфічнага паказчыку на дзяржаўныя працэсы патрабуе спецыяльнага даследавання.

Да групы маладаследаваных, але ўплываючых на ўнутраны патэнцыял функцыянавання Беларусі трэба аднесці наступныя тэмы: тэрытарыяльныя і экалагічныя ўмовы жыцця і працы людзей; паказчыкі захворвання; шлюбнасці, сямейнасці савецкіх беларусаў; шляхоў зносін гараджан і вяскоўцаў; зносін у працоўных калектывах, у тым ліку з кіраўніцвам, і іншыя моманты, якія часта адносяць да мікрапаказчыкаў сацыяльна-дэмаграфічнай гісторыі.

Падсумоўваючы вышэйпрыведзены матэрыял, можна зрабіць наступную выснову аб тым, што грамадства Беларускай ССР у сярэдзіне 50 – 60-х гг. XX ст., з'яўляючыся часткай вялікага агульнасавецкага соцыума, адчувала на сабе дзеянне агульных працэсаў. Сярод іх адзначым: дэмакратызацыя ўсіх сфер грамадскага жыцця і ўдзел у партыйным кіраўніцтве, заахвочванне працоўных рук у горад на вытворчасць, будаўніцтва, транспарт і іншыя сферы прафесійнай дзейнасці. Заняд-банне і крызіс у сельскагаспадарчай сферы і адток сельскіх жыхароў, павелічэнне ролі партыйнага ўдзелу ў прафсаюзных арганізацыях і заахвочванне камсамольскай моладзі да ўдзелу



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ў партыйных глабальных ініцыятывах. Аднак неабходна адзначыць, што грамадства Беларусі ў цэлым і яго дэмаграфічныя характарыстыкі мелі асаблівасці. Сярод іх можна адзначыць: запаволеныя тэмпы росту гарадскога насельніцтва пры захаванні цеснай сувязі з вёскай і вялікай доляй сельскагаспадарчай працы гараджан; слабы ўдзел радавых камуністаў беларускага паходжання ў кіраўніцтве партыйных арганізацый і на прадпрыемствах рэспублікі. Беларускі камсамол арганізоўваў добраахвотныя працоўныя атрады ў асноўным для ўдзелу ва ўсесаюзных будоўлях на тэрыторыі БССР і ў сельскай гаспадарцы. А таксама можна адзначыць супярэчлівую сацыяльна-дэмаграфічную сітуацыю на землях далучанай Заходняй Беларусі.

Бясспрэчнай з'яўляецца выснова, што соцыум – гэта аб'ект гістарычнай творчасці. У дзяржаўнаўтваральных працэсах прымала ўдзел грамадства, разнастайнае па сваіх дэмаграфічных характарыстыках, яно падштурхоўвала партыйнае кіраўніцтва да прыняцця адпаведнага заканадаўства ў сферы гаспадаркі, палітыкі, адукацыі і культуры, будаўніцтва і транспарта, сістэмы аховы здароўя і інш. Дзяржава ў часы дэмакратызацыі рабіла спробу падтрымліваць ініцыятыву "знізу" і наладжваць сваё далейшае станаўленне з улікам патрэб грамадства.

### Спіс выкарыстаных крыніц

1. История белорусской государственности : в 5 т. Т. 1 : Белорусская государственность: от истоков до конца XVIII в. / А. А. Коваленя [и др.] ; отв. ред. тома: О. Н. Левко, В. Ф. Голубев ; Нац. акад. наук Беларуси, Ин-т истории. – Минск : Беларуская навука, 2018. – 598 с.
2. Нарысы гісторыі Беларусі : у 2 ч. Ч. 2 / М. П. Касцюк, І. М. Ігнаценка, У. І. Вышынскі [і інш.]. – Мн. : Беларусь, 1995. – 560 с.
3. Пономарёва, Е. Г. Республика Беларусь: внутренние факторы развития государственности / Е. Г. Пономарёва // Проблемы управления. – 2014. – № 3. – С. 17–22.
4. Риер, Я. Г. Историческая демография : учеб. пособие для студентов / Я. Г. Риер. –Могилев : МГУ имени А. А. Кулешова, 2006. – 160 с.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова